




*Дню Перамогі прысвячаўся канцэрт, які адбыўся ў Вялікай зале сталічнай філармоніі. Праграму з удзелам лепшых маладых музыкантаў, якая працягвалася без малога чатыры гадзіны, падрыхтавалі тры асацыяцыі, што працуюць пры БСМД: цымбалістаў; дамрыстаў і мандалiністаў; баяністаў і акардэаністаў. Канцэртным нумарам папярэднічала эмацыянальнае, палымянае і мудрае выступленне аднаго са старэйшых дзеячаў айчыннай культуры, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Міхаіла Солапава (на здымку). У чарадзе яскравых імгненняў, падораных удзельнікамі гэтага непаўторнага вечара, уражвала жывое, прачулае, шчырае ўвасабленне самых розных мастацкіх вобразаў. Авацыямі вянчала публіка ігру ансамбля дамрыстаў БДАМ "Эстафета"; дуэта цымбалістак; лаўрэата многіх музычных спаборніцтваў дамрысткі Н. Корсак, пераможцы 30-ці міжнародных конкурсаў баяніста У. Плігаўкі (гл. фота)... Тэмпераментным апафеозам вечара прагучала выступленне аркестра беларускіх народных інструментаў БДУ культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам маэстра В. Валатковіча.*

С. ВЕТКА

**Фота Святланы Берасцень**